*А. І. Смолік*

# СВЯТОЧНАЯ КУЛЬТУРА Ў ПАЭМЕ Я. КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ»

Свята ў культуралогіі разглядаецца як інстытут культуры, які выступае як грамадская падзея ўрачыстага характару, адасобленая ад паўсядзённасці, якая адбываецца ў вольны ад працы час. Гэты непрацяглы адрэзак часу мае асаблівую сувязь са сферай сакральнага і прадугледжвае максімальнае дачыненне да гэтай сферы ўсіх удзельнікаў свята. Традыцыйная культура беларусаў не толькі структурыравала і ўпарадкоўвала час гаспадарчай дзейнасці чалавека, але і вызначала тэрміны правядзення свят. Святаўтваральным фактарам для ўсходніх славян, у тым ліку і беларусаў, быў рух Сонца і Месяца. Народны каляндар уяўляе ўпарадкаваную сістэму падзелу, лічэння і рэгламентацыі гадавога часу, арганізацыі святочнага цыкла, а таксама гаспадарчай і побытавай практыкі. Ён задаваў пэўны рытм жыцця чалавечай супольнасці, садзейнічаў гармоніі ўнутранага, духоўнага космаса чалавека з навакольным светам, рытмамі і цыкламі Сусвету. Акрамя традыцыйнага календара славянскіх народаў значны уплыў на святочную культуру беларусаў аказала сістэма хрысціянскага летазлічэння, у аснову якога былі пакладзены падзеі з жыцця Ісуса Хрыста і Багародзіцы. Так, паралельна са святамі народнага каляндара (Каляды, Грамніцы, Масленка, Купалле і іншыя) існуюць хрысціянскія святы (Божае Нараджэнне, Вялікдзень, Юр’я, Пятра і Паўла, Ілля, Раство Багародзіцы і інш.) [3].

На працягу многіх стагоддзяў існавання традыцыйнай культуры беларусаў склаўся велізарны комплекс народных, рэлігійных і дзяржаўных свят, якія знайшлі адлюстраванне ў беларускай мастацкай літаратуры. Найбольш шырокім па ахопе жыццёвых падзей народа, яркім па форме і глыбокім па думцы творам беларускай літаратуры з’яўляецца паэма Я. Коласа “Новая зямля”. У ёй праўдзіва і па-мастацку пераканаўча раскрыта святочная традыцыйная культура беларускага народа. З грунтоўнасцю, паэтычнай дэталізацыяй песняром падаюцца малюнкі шэрагу народных і рэлігійных свят. Якуб Колас, сам сялянскі сын, дасканала ведаў святы традыцыйнага народнага календара, хрысціянскія святы і святы сямейна-радавога цыкла (нараджэнне чалавека, хрэсьбіны, вяселле і інш.).

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Каляды – першае свята ў цыкле каляндарнага года, якое ў традыцыйнай культуры ўсходніх славян звязана з таямніцай зараджэння, вытокаў усеагульнага пачатку. Яно супадала з важнейшай прыродна-касмічнай падзеяй: заканчэннем зімовага сонцастаяння і паваротам яго на новы гадавы цыкл. У хрысціянскай традыцыі ў гэты самы час нарадзіўся Ісус Хрыстос, таму паралельна з Калядамі славяне адзначаюць Божае Нараджэнне. Сакральнасць гэтай падзеі вызначыла характар паэтычнай вобразнасці, стылю і мовы дваццатага раздзела паэмы «Каляды». Колас надзвычай ярка паказвае пачуцці людзей напярэдадні свята. Дзеці і дарослыя з нецярплівасцю чакаюць гэтай падзеі, іх думкі задоўга да Каляд звязаны з сустрэчай згаданага свята. Увага дзяцей усё больш канцэнтруецца не на вучобе, а на падрыхтоўцы да свята:

І думка іх не тым занята, усе болей ходзіць каля свята.
І міла гэта іх чаканне! [1, с.199].

Каляды суправаджаліся цікавымі і маляўнічымі рытуальна-абрадавымі дзеяннямі, якія грунтоўна ведаў паэт і шматфарбна апісаў у сваім творы. Колас у кантэкст каляднага абрадавага дзейства ўключае шырокае кола прадметаў. У іх якасці выступалі ежа, адзенне, сена, ялінка, цацкі, стол і інш. Калядавым абрадным атрыбутам, адзначае паэт, з'яўляецца япрук, якога напярэдадні свята забіваюць:

І кожны дворык, кожна хата,
Хоць і жыве не так багата,
Але калядаў у адзнаку
Заколе хоць бы падсвінаку [1, с.200].

Ежа выступае ў паэме як своеасаблівы сімвалічны код у структуры свята. Рытуальныя стравы залежалі ад пор года і пастоў. Так, святкаванне Каляд у творы пачынаецца з абрадавай вячэры, якая называецца куццёй. Галоўная рытуальная страва – куцця, уяўляла сабой ячменную кашу, аздобленую мёдам. З выключным лірызмам паэт паказвае сімвалічнае значэнне куцці:

І вось цяпер гаршчок з куццёю,
Як цар даўнейшаю парою,
У пачэсны кут, на свой прастол,
Стаўляўся з гонарам на стол [1, с.202].

Акрамя куцці на святочны стол ставілі «акунькі, мянькі і плоткі», квас, верашчаку, блінчыкі на маку, ламанцы-праснакі, кампоты,

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

«кісель з мядоваю сытой». Зусім іншыя абрадавыя стравы паказаны ў паэме падчас Вялікадня. Галоўнай рытуальнай стравай у велікоднае сняданне было чырвонае яйцо, асвечанае ў царкве. Яго дзялілі на столькі частак, колькі ў сям'і было чалавек. Раніцай, пакуль за святочным сталом не разгавеюцца велікодным яйцом, есці нічога іншага нельга.

І гуртам яйкі ачышчаюць,
І па кусочку іх бяруць,
Крыху падсольваюць, ядуць [1, с.237].

Велікоднае сняданне Я. Коласам выткана з сапраўдных вясёлкавых слоў-вобразаў. Шынка параўноваецца з кадушкай, «кілбасы-скруткі, як падковы», «усмажаны падсвінак, як бы паніч той надзіманы», «а пірагі, як сонца, ззялі і бабкі ў роце раставалі» [7, с.237].

На першы Спас (14 жніўня) у якасці рытуальных страў выступалі мёд і мак. Гэта было свята пчаляроў. У раздзеле «Падгляд пчол» Я. Колас красамоўна расказвае, як у Парэччы «заламавалі соты». Святым правілам традыцыйнай культуры беларусаў было частаванне мёдам сваякоў, суседзяў, сяброў. Я. Колас – добры знаўца святочнай культуры – вобразна апісвае сцэну адорваня сваякоў новым мёдам:

Прынеслі ночвы мёду ў хату.
На долю выпала Кандрату
Дзяліць мёд гэты між кумамі [1, с.140].

У гэты дзень у царкве асвячалі і мак. Па традыцыі неабходна было на стол падаваць пірагі з макам. Таму Ганна ласкава і пачціва частуе сваіх гасцей пірагамі, сырам, маслам, мясам, кумпячком, каўбаскамі. Безумоўна, на ўсіх святочных сталах абвязкова пысутнічала гарэлка:

Міхал бутэльку адтыкае,
Бо ўжо закуска тут чакае [1, с.204].

У нядзелю, якая ў традыцыйнай святочнай культуры лічылася святочным днём, стравы таксама адрозніваліся ад звычайных. Пасля шасці працоўных дзён людзі рабілі перапынак у паўсядзённай руціне. Стол таксама адрозніваўся ад будніх дзён. На сняданне прыгатаўляліся святочныя стравы, найчасцей бліны з верашчакай, смятанай, тварагом. Я. Колас у жартоўна-іранічным настроі распавядае пра баўленне нядзельнай раніцы ў лясніковай сям'і:

Дзень быў святы.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Яшчэ ад рання
Блінцы пякліся на сняданне [1, с.38].

Такім чынам, у паэме «Новая зямля» абрадавая ежа выступае пэўным ключом да разумення сутнасці святочных падзей. Колас адносіць да абрадавых страў зярно, яйка, рыбу, мак, мёд, бліны, каравай, кісель, грыбы, верашчаку, кашу, гарэлку, квас. Пералічаныя стравы адпавядалі традыцыйным святочным атрыбутам усходніх славян, большасць якіх выкарыстоўваецца падчас свят і ў нашыя дні.

Абавязковым кампанентам святочнага дзейства ў паэме з'яўляюцца многія прадметы. Напрыклад, рытуальнае значэнне на Каляды мае сена. На калядны стол клалі сена як напамінак аб тым, што Ісус Хрыстос нарадзіўся ў яслях. Аб гэтым добра ведалі ў сям'і Міхала і бездакорна выконвалі ўстаноўлены рытуал:

На стол растрэсваюць мурог –
На сене колісь быў сын-бог –
І роўным пластам расцілаюць,
Сянцо абрусам закрываюць [1, с.204].

Пасля каляднай вячэры сена са стала раніцой аддавалі хатняй жывёле, каб тыя былі здаровымі і добра пладзіліся. З дапамогай рытуальнага сена людзі імкнуліся атрымаць сімвалічную інфармацыю аб будучым ураджаі:

На першы дзень святых калядак –
Такі ўжо стары парадак –
Збіралі сена са стала,
Кармілі ім каня, вала
І ўсіх жывёлін, хоць па жмені.
А на стале, у драбнюткім сене –
Здавен-даўно вялося й гэта –
Уважна зернятак шукалі
І па тых зернятках гадалі,
Які зародзіць хлеб на лета [1, с.205].

Кампанентам велікоднага свята былі дары працы, якія асвячалі ў царкве:

Нясуць жанкі, нясуць мужчыны
Кашы, каробкі, паўасьміны
І ставяць іх на цвінтары
Усе велікодныя дары [1, с.235].

Важнейшым атрыбутам вызначэння святочнага статусу з'яўляецца адзенне. Кожны ўдзельнік свята імкнуўся аздобіць сябе

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

новай вопраткай, якая б адпавядала сутнасці таго альбо іншага свята, якая пераўвасабляла б у святочны дзень чалавека. Я. Колас паказвае, што ўся сям'я Міхала ніколі не сустракала свята ў буднім адзенні. Вопратка заўжды была чыстая альбо новая:

А для гасцей, святой нядзелькі
Надзелі новыя камзэлькі,
А боты так нашмаравалі,
Што проста шляхту касавалі [1, с.135].

У калядны вечар дарослыя і дзеці лесніковай сям'і таксама ўсе «прыбраліcь і памыліcь, Міхал з Антосем пагаліліcь» [1, с.204].

Жанчыны да царквы на Вялікдзень, распавядае паэт, ідуць «у хустках белых і чырвоных». Перад святам героі паэмы імкнуліся набыць нешта новае. Хоць у сям'і Міхала эканомілі кожную капейку, бо збіралі грошы на зямлю, але на свята куплялі абновы:

Ідуць да дому, разважаюць,
Чаго на святы накупляюць[1, с.202].

У якасці абрадавага рытуальнага кампанента ў святочнай культуры нярэдка выступалі прадметы гаспадарчай дзейнасці: сярпок крывенькі, каса, павозка, стол, ручнік і інш. Яны таксама аздабляліся напярэдадні свята, прыводзіліся ў належны парадак і выкарыстоўваліся ў святочных дзеяннях.
У паэме Я. Колас часта малюе сцэны падрыхтоўкі прадметаў быту да таго альбо іншага свята. Перад паездкай да царквы:

Антось агледзеў тут прылады,
Калёсам добра даў «памады» [1, с.232].

Напярэдадні агляду зямлі «Міхал з Антосем воз прыбралі».

Функцыю святочнага атрыбуту ў традыцыйнай культуры беларусаў выконвалі і шэраг прадметаў прыроднага паходжання. Так, у паэме леснікова хата аздаблялася елкай, веткамі клёну, двор пасыпаўся жоўтым пясочкам. На каляды ў хаце ладзілася елка, якая ўпрыгожвалася цукеркамі, арэхамі: «Ялінка ў хаце так прыгожа!» [1, с. 203].

Надзвычай вялікая ўвага надавалася беларусамі выбару прасторы, у якой праводзіліся святы. Месцам правядзення свят маглі служыць луг, поле, вуліца, двор, лес і інш. Я. Колас у сваім творы дэталёва раскрывае ролю адкрытай і закрытай святочнай прасторы. Большасць свят, пра якія ідзе гаворка ў паэме (Каляды, Вялікдзень), адбываюцца ў лесніковай хаце і двары. Святочная прастора, як і самі людзі, пераўтваралася падчас свят. Двор, хата прыводзіліся ва ўрачысты выгляд:

На гэты дзень і сама хата

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Была прыбрана зухавата:
Памыты лава, стол, падлога [1, с.136].

Дом упрыгожваўся зялёнымі веткамі, лугавымі кветкамі, стол засцілаўся белым абрусам, іконы ўпрыгожваліся каляровай паперай:

Святых паперай агарнулі –
Яны лагодней нейк зірнулі [1, с.136].

Каб надаць святочнай падзеі большую ўрачыстасць каля хаты, героі паэмы аздаблялі наваколле:

І падмялі двор дзеркачамі;
Пясочку потым накапалі
І сцежкі ім павысыпалі [1, с.231].

Цэнтрам святочнай прасторы заўсёды з'яўлялася царква. Гэта культавае збудаванне прызначана для богаслужэння і рэлігійных абрадаў. Кожны элемент храма і яго мастацкае аздабленне маюць сімвалічны сэнс і тлумачэнне (карабель, космас, цела Хрыстова, дом Гасподзень, Іерусалімская горніца). У царкве ажыццяўляецца яднанне герояў паэмы з Богам праз сумесны ўдзел у таінствах. Вось чаму падчас свята яны імкнуцца да царквы:

А цэрква, макаўка святая,
Народу поўна, бляскам ззяе [1, с.234].

Храм вылучаецца сярод мястэчковай і гарадской забудовы сваімі памерамі, манументальнымі формамі, дэкаратыўным убраннем. Ён найчасцей размяшчаўся на вузлавых участках населеных пунктаў. Я. Колас вачыма дзядзькі Антося абмалёўвае храмы Вільні, якія ўразілі Антося сваёй веліччу:

Угары, высока над дамамі,
Пазалачонымі крыжамі
Блішчалі цэрквы і касцёлы,
Узняўшысь к небу галавамі [1, с.295].

Святочная прастора паказана ў паэме як сфера эстэтычнага. Сузіранне яе шматколернасці, гарманічнай прыгажосці выклікае ў герояў паэмы не толькі захапленне, святое трапятанне сэрца, але прыносіць ім заспакаенне, дае жыватворныя сілы, надзеі на лепшую будучыню.

У святочнай традыцыйнай культуры вялікую ролю адыгрывае слова. Святочнае дзеянне заўсёды суправаджалася ўключэннем энергетычнага патэнцыялу слова, якое вымаўлялі яго ўдзельнікі. З дапамогай слова ў рознай форме (песні, прытчы, казкі, загадкі, святочнага пажадання, малітвы і інш.) чалавек зносіўся з Богам, святымі, памерлымі продкамі, навакольнай прыродай. Я. Колас

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

асабліва ўважліва адбірае моўны матэрыял пры абмалёўцы святочных падзей і характарыстыцы ўдзельнікаў свята. Сваякі Міхала падчас свята з нагоды падгляду пчол прыгожа спяваюць. У песнях раскрываюцца іх душа, мары, надзеі, нявыказаныя пачуцці, духоўнае багацце народа. Спяваннем суправаджаюцца рэлігійныя святы. Так, перад велікодным сняданнем дарослыя і дзеці спяваюць «Вэсолы»:

А гаспадар усё болей з баса
Уткне такога выкрунтаса,
Аж сам падзівіцца сабе [1, с.237].

Велікодныя псалмы спявалі таксама сем'і сваякоў у Свержані, куды Міхал і Антось прыехалі, каб асвянціць святочныя стравы:

У Яўхіма дзядзькі, у Базылёвых,
Таксама ў Стасечкі і Даткі
Свае захоўвалі парадкі:
Сядзелі згодна і набожна
І спеў святы вялі заложна [1, с.233].

Функцыянальную накіраванасць маюць у паэме святочныя пажаданні, з якімі звяртаецца Міхал, Антось і іх госці падчас застолля. Удзельнікі свята жадаюць адзін аднаму здароўя, даўгалецця, не ведаць гора і смутку. Пажаданні напоўнены спадзяваннямі на добры ўраджай, багаты прыплод хатняй жывёлы, прыбытак у гаспадарцы. Так, за куццёй Міхал звяртаецца да Антося з наступнымі пажаданнямі:

Няхай дае Бог лад у хаце,
Дабра, прыбытку прыспарае.
Каб у хляве ды ўсё пладзілась,
Каб жыта ў полі каласілась,
Няхай раяцца твае пчолы,
І самі будзем мы вясёлы [1, с.204].

Традыцыйная святочная культура беларусаў патрабуе актыўнага ўдзелу ў абрадах і рытуалах усіх суб'ектаў соцыуму. Гэта тлумачыцца тым, што сродкамі святочнага дзейства ў памяці людзей узнаўляюцца вышэйшыя каштоўнасці быцця, з якімі звязаны сэнс існавання чалавека. На старонках паэмы яе галоўныя героі (Міхал і Антось) нярэдка па-філасофску трактуюць тэму жыцця і смерці, разважаюць аб неразгаданасці і таямнічасці жыццёвых законаў, мнагалучнасці сувязей паміж жывым і нежывым, агульным і прыватным. Святы паэт разглядае як канцэнтрацыю жыцця, вынік працы, творчай дзейнасці чалавека, яе плёну. Таму ўсе павінны ўсвядоміць неабходнасць стваральнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

працы на зямлі-карміцельцы. Усе атрыбуты свята створаны розумам і рукамі чалавека, у святочных абрадах і рытуалах яны набываюць сакральнае значэнне. Семантызацыя артэфактаў ствараецца ў працэсе падрыхтоўкі да свята і ў рытуалах. Выключна ўсе героі паэмы ўдзельнічаюць у падрыхтоўцы да свят. Напярэдадні Каляд Кастусь з дзядзькам Антосем ідуць на рэчку, каб налавіць рыбы для святочнага стала. Астатнія члены сям'і лесніка выконваюць іншыя віды працы, каб не рабіць яе ў святочныя дні:

І дроў на свята накалолі,
Трасянкі загадзя натрэслі,
Сянца пахучага прынеслі [1, с.202].

Дзеці перад Вялікаднем аздабляюць святочную прастору:

Алесь, Кастусь і Міхаліна –
Сама найшла на іх часіна –
На працу зранку выйшлі самі [1, с.231].

Дарослыя і дзеці, усе да аднаго, спяваюць на Вялікдзень псалмы:

Хоць спевы слухаць неахвочы,
Але трымаюць дзеці згоду [1, с.236].

Адсвяткаваць збор новага мёду сабралася не толькі сям'я Міхала, але і іх шматлікая радня.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, неабходна адзначыць, што ў духоўнай спадчыне Я. Коласа адлюстраваны шматлікія элементы святочнай традыцыйнай культуры беларускага народа. Паэму «Новая зямля» можна лічыць своеасаблівай энцыклапедыяй па айчыннай культуралогіі. Акрамя багатага пласта святочнай культуры ў творы Я. Коласа грунтоўна паказаны сацыяльныя субкультуры: вясковая, гарадская, дзіцячая, чыноўніцкая.

---

1. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма / агульн. рэд., пасляслоўе Я. Янушкевіча; уклад. У. Гілеп, Я. Янушкевіч; прад. М. Мушынскага; пер. на рус. С. Гарадзецкага і інш.; пер. на пол. Ч. Сэнюха; камент. М. Мушынскага, Я. Янушкевіча; мастак В. Шаранговіч / Я. Колас. – Мінск: БФК, 2002. – 904 с., 91 л. іл.

2. *Крук, И. И.* Колесо времени: традиции и современность / И. И. Крук, О. В. Котович. – Изд. 2-е, доп., исправл. – Мінск: Беларусь, 2005. – 352 с.

3. *Крук, Я.* Сімволіка беларускай народнай культуры / Я. Крук. – Мінск: Беларусь, 2003. – 350 с.: іл.

4. *Налівайка, А. М.* Якуб Колас / А. М. Налівайка // Гісторыя беларускай літаратуры: XX ст. (20–50-я гады): падручнік / У. В. Гніламёдаў, В. В. Казлова, М.А. Лазарук [і інш.]; пад агул. рэд. М.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

А. Лазарука, А. А. Семяновіча, – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 2000. – С. 257–298.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ